# РОЛЯ ВАЦЛАВА ЛАСТОЎСКАГА Ў КАНСТРУЯВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СІМВАЛА «СЛУЦКІ ПОЯС»

***В. А. Лабачэўская,***
*дацэнт кафедры этналогіі і фальклору,*
*доктар мастацтвазнаўства, дацэнт;*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

У фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці ў XX ст. слуцкім паясам належыць адна з найбольш знакавых і дзейсных роляў. Шаўковыя паясы з сігнатурамі Слуцкай мануфактуры бліжэй да сярэдзіны XIX ст. выйшлі з ужытку ў шляхецкім строі. У магнацкіх палацах і шляхецкіх маёнтках слуцкія паясы захоўваліся як каштоўныя і прыгожыя творы мастацтва побач са старасвецкімі партрэтамі продкаў, пажоўклымі ад часу паперамі былых каралеўскіх прывілеяў, нагадваючы нашчадкам пра славутыя часы існавання Вялікага Княства Літоўскага і шляхецкія вольнасці Рэчы Паспалітай. Як родавыя рэліквіі яны з усёй відавочнасцю матэрыялізавалі гістарычную памяць аб велічы культуры, што квітнела на беларускіх землях. Каштоўныя сведчанні былой раскошы, шаўковыя, «літыя» і «паўлітыя» залатыя і сярэбраныя паясы з сігнатурамі Слуцкай мануфактуры ўспрымаліся як ўвасабленне страчанай волі і незалежнасці.

Ля вытокаў канструявання нацыянальнага сімвала беларусаў – слуцкіх паясоў стаяў пісьменнік, публіцыст, гісторык, філолаг, літаратуразнавец, этнограф Вацлаў Ластоўскі (1883–1938). На жаль, у біяграфічных публікацыях, прысвечаных вядомаму беларускаму грамадскаму і палітычнаму дзеячу, гэты факт не акцэнтаваны. Па сутнасці, не распрацавана таксама і тэма аб шляхах фарміравання сімвалічнага зместу слуцкіх паясоў у беларускай культуры. Таму звернемся да распрацоўкі праблемы, якая была ўжо заяўлена ў адной з папярэдніх публікацый [7] і мае на мэце вызначыць ролю Вацлава Ластоўскага ў канструяванні міфалагемы «слуцкі пояс». Актуальнасць тэмы і праблемы абумоўлена тым, што ў апошнія гады слуцкі пояс як нацыянальны сімвал актуалізаваны ў Беларусі на дзяржаўным узроўні [1].

У сваіх публікацыях Вацлаў Ластоўскі неаднойчы звяртаўся да тэмы слуцкіх паясоў. У 1909–1915 гг. Ластоўскі, працуючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сакратаром газеты «Наша ніва», штодня меў перад сваімі вачыма сапраўдныя слуцкія паясы, якія належалі да збору беларускай старасветчыны Івана Луцкевіча і размяшчаліся ў памяшканні рэдакцыі газеты ў Вільні. Паэт Змітрок Бядуля, наведаўшы рэдакцыю ў 1912 г., пісаў пад уражаннем ад ўбачанага: «На сценах вісяць абразы беларускіх даўнейшых князёў, старасвецкія беларускія вопраткі, мэбля, шаломы і панцары ваякаў XVI стагоддзя. Розныя тканіны народнай беларускай творчасці, паясы слуцкія, дываны, разьба розная…» [6, с. 308]. Гэтыя каштоўныя экспанаты, у тым ліку слуцкія паясы і іх часткі, збіральнік першага беларускага музея, як сведчаць сучаснікі, знаходзіў на кірмашах, пад падстрэшкамі старых шляхецкіх двароў, у перакупшчыкаў і рызнікаў або ледзь не на сметніках [6, с. 308]. У 1913 г. 176 прадметаў гэтай калекцыі былі паказаны на Першай краёвай выстаўцы народнага мастацтва і дробнага промыслу ў Вільні [6, с. 158]. Ёсць падставы меркаваць, што і сам В. Ластоўскі ва ўласным зборы, нараду з беларускімі старадрукамі, меў сапраўдныя ўзоры слуцкіх паясоў. Знаўца беларускага мастацтва, чалавек, які захапляўся прыгажосцю злататканых тканін, выробленых у славутым Слуцку, менавіта ён падштурхнуў паэта Максіма Багдановіча на стварэнне знакамітага верша «Слуцкія ткачыхі».

Паэт быў у захапленні ад мастацтва слуцкіх паясоў і, абвострана адчуваючы іх роднасць гісторыі і культуры Беларусі, стварыў у сваім славутым вершы высокапаэтычны вобраз нацыянальнага сімвала.

*Ад родных ніў, ад роднай хаты*
*У панскі двор дзеля красы*
*Яны, бяздольныя, узяты*
*Ткаць залатыя паясы.*

З успамінаў В. Ластоўскага вядомы акалічнасці стварэння верша. У чэрвені 1912 г. Багдановіч наведаў Вільню. У рэдакцыі першай беларускай газеты «Наша Ніва» ён азнаёміўся з узорамі слуцкіх паясоў і іншымі творамі беларускай старасветчыны, якія належалі да збораў Івана Луцкевіча. В. Ластоўскі пісаў аб сустрэчы з паэтам: «М. Багдановіч прыехаў у Вільню ўжо як актыўны і свядомы працаўнік беларускага (крыўскага) адраджэння, глыбей сягаючы думкай у будучыню нашага народу, чым мы, працаўнікі, згрупаваныя ў цэнтры. Гэтыя яго думкі былі асноўнай нашай тэмай нашых начных бясед […].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абедзве ночы начаваў у рэдакцыі “Нашай нівы” […]. Абедзве ночы я правёў разам з ім, і кожны раз гутаркі нашы зацягаліся ад змяркання да світання. Багдановіч дзяліўся сваімі думкамі і з захапленнем пераймаў ад мяне мае ведамасці з беларускай (крыўскай) этнаграфіі і гісторыі, якія я пераказваў яму як умеў, дэманструючы быўшыя пры рэдакцыі калекцыі Івана Луцкевіча. Асабліва глыбокае ўражанне на Багдановіча зрабілі рукапісы старасвецкіх славянскіх кніг і дакументаў, а такжа слуцкія паясы, якія па некалькі разоў пераглядаў. “Гэта ёсць фундамент нашага адраджэння! Гэта і за тысячу гадоў будзе сведчыць аб нас!” – казаў М. Багдановіч аб помніках нашай старасвецкай культуры» [8; 10].

Першы свой артыкул аб слуцкіх паясах В. Ластоўскі надрукаваў у газеце «Гоман» (24 сакавіка 1916 г.) у раздзеле «З антыкварскіх запісак» [11]. Вытворчасць слуцкіх паясоў аўтар узводзіць да слуцкіх і капыльскіх майстэрань князёў Алелькавічаў, якія ў канцы XIII ст. прывезлі ткачоў з Кіева. Апісваючы мастацкія асаблівасці кунтушовых паясоў, якія выраблялі ў Слуцку, ён піша: «Спярша ткачы стараліся ткаць чыста персkія ўзоры на паясах, але чым далей, тым меней аставалася ў слуцкіх тканінах перскага: іх заступалі ўзоры свае – беларускія і еўрапейскія. …Арнаментыка на слуцкіх паясах пераказала нам старабеларускія ткацкія ўзоры, наіншых паясах перамешаныя з перскімі, а на іншых саўсім ачышчаныя ад чужых уплываў» [9, с. 197]. В. Ластоўскі завяршыў артыкул сцвярджэннем, што для беларусаў паясы слуцкія маюць асаблівую цану, як помнік беларускай культуры.

Тэмай слуцкіх паясоў Ластоўскі цікавіўся і надалей. Падрабязны і разгорнуты артыкул «Слуцкія паясы», напісаны з прыцягненнем больш шырокага кола крыніц і тагачаснай літаратуры на гэтую тэму, ён змясціў у 1924 г. у часопісе «Крывіч», які выдаваў у Коўне. У ім аўтар, з уласцівым яму палемічным запалам, бараніў нацыянальную прыналежнасць слуцкіх паясоў: «Мастацкая слава слуцкіх паясоў спакусіла палякаў прызнацца да гэтага вытвару беларускага промыслу і мастацтва ды рэклямавацца імі перад легкавернай заграніцай, дзе палякі звыклі выдаваць слуцкія паясы як “Pasy polskie”. Амбіцыя палякаў і прыродная склоннасць перабівацца чужым дабром спанукнула з іншага боку даволі паважных польскіх аўтараў лгаць, не толькі што слуцкія паясы – вытвор польскі, але да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

смешнай брахні, як: “Robotnikami byli sami polacy, ze Slucka przewaznie”» [9, с. 196]. Абапіраючыся на архіўныя звесткі, прыведзеныя А. Ельскім [3], В. Ластоўскі пісаў, што кунтушы з паясамі ніколі не былі польскай вопраткай, – іх насілі беларускія ды ўкраінскія баяры і мяшчане, даў гісторыю ўзнікнення Слуцкай персіярні і вызначыў мастацкія асаблівасці слуцкіх паясоў. Як даследчык, ён адзначыў, што калі першыя слуцкія вырабы насілі персідскі стыль, капіравалі персідскія ўзоры, то ў хуткім часе да іх дадаліся «матывы, саўсім нязнаныя персам, пачэрпнутыя з чыста мясцовага грунту», штораз болей вытыкаецца кветак краёвай флоры, сярод якіх улюбёнымі былі васількі, або валошкі, і чырвоныя гваздзікі, а ўжо ў другім дзесяцігоддзі існавання Слуцкай персіярні ўзоры на паясах маюць «саўсім асобны свой стыль». Пры гэтым Ластоўскі падкрэсліваў, што слуцкія паясы маюць для беларусаў асаблівую каштоўнасць як аснова для распрацоўкі характэрнага нацыянальнага стылю.

Малавядомы факт: менавіта В. Ластоўскі першым выкарыстаў матывы арнаменту слуцкіх паясоў для афармлення друкаванага выдання і, па сутнасці, запачаткаваў напрамак звароту да нацыянальных матываў у беларускай кніжнай графіцы, які стаўся цэнтральнай тэмай графічнага афармлення беларускіх кніжных выданняў і часопісаў у першай палове XX ст. В. Ластоўскі ўласнаручна намаляваў застаўкі і канцоўкі з узорамі матываў шлячкоў на слуцкіх паясах для літаратурна-публіцыстычнага зборніка «Маладая Беларусь», што выдавала ў Пецярбургу першае беларускае выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца» Вацлава Іваноўскага ў 1912–1913 гг. Натхняўся ён узорамі паясоў, якія знаходзіліся ў яго ўласнай калекцыі і якія меліся перад яго вачыма ў рэдакцыі газеты «Наша ніва». Гэтая цікавая акалічнасць біяграфіі В. Ластоўскага засведчаны допісам выдавецтва на вокладцы часопіса. Дадзены факт, пра які не згадваюць біёграфыслыннага дзеяча беларускага адраджэння, сведчыць пра мастацкія здольнасці Ластоўскага, якія ён выкарыстоўваў на карысць беларускай справе.

Застаўкі і канцоўкі, намаляваныя В. Ластоўскім, паўтораны ва ўсіх сшытках зборніка «Маладая Беларусь». У графічных чорна-белых застаўках выданняў без цяжкасці распазнаюцца характэрныя раслінна-кветкавыя матывы арнаменту паясоў Слуцкай шоўкаткацкай мануфактуры: зубчастае лісце, харак-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрныя выявы кветак, адмыслова злучаныя паміж сабой. Вылучаныя з бардзюраў, узятыя паасобна, пададзеныя ў чорна-белым выкананні, яны ўспрымаюцца як выразныя знакі беларускага арнаменту.

Аб нацыянальна-культурнай беларускай ідэйнай і змястоўнай накіраванасці літаратурна-публіцыстычнага зборніка «Маладая Беларусь» сведчыць і мастацкае афармленне вокладкі выдання. На вокладцы, выкананай мастаком, імя якога рэдакцыяй пададзена толькі ініцыяламі «Н. М.», змешчаны сілуэтныя выявы двух беларускіх каўшоў (карцоў) з-пад Чашнік з калекцыі віцебскага землеўладальніка і збіральніка твораў народнага мастацтва і даўніны І. Валадковіча і ўзоры са слуцкага пояса з калекцыі «Нашай Нівы». Можна меркаваць, што ў мастацкім праектаванні вокладкі выдання «Маладая Беларусь» таксама прымаў удзел В. Ластоўскі.

Аб захапленні Ластоўскім хараством шаўковых слуцкіх паясоў, іх характэрным беларускім стылем сведчыць кніжны знак – экслібрыс на кнігах з яго бібліятэкі з адлюстраваннем выразнай і распазнавальнай слуцкай раслінна-кветкавай арнаментыкі, якая беспамылкова нагадвае славутыя радкі Максіма Багдановіча: «І тчэ, забыўшыся, рука заміж персідскага ўзору…»

Аб экслібрысе В. Ластоўскага 1912 г. з выявай арнаменту слуцкіх паясоў як аб адным з першых беларускіх кніжных знакаў згадваецца ў прадмове да кнігі А. Шлюбскага «Exlibris'ы А. Тычыны» (1938). Экслібрыс датаваны вельмі плённым перыядам творчага і грамадскага жыцця В. Ластоўскага, калі той жыў у Вільні, працаваў рэдакцыйным сакратаром «Нашай Нівы», быў загадчыкам першай беларускай кнігарні ў Вільні, надрукаваў сваю першую навуковую працу «Кароткая гісторыя Беларусі» (1910).

Вядомы дзве кнігі з кнігазбору В. Ластоўскага з гэтым экслібрысам. Выданне «Белорусские народные рассказы» І. Д. Арлоўскага (Полацк, 1908) захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь [11; 12, с. 129]. Другая кніга, якая належала вядомаму беларускаму дзеячу, – «Смык беларускі» Ф. Багушэвіча (Познань, 1894) знаходзіцца ў прыватным зборы Алеся Юркоця – краязнаўца з в. Варняны Астравецкага раёна [16, с. 44]. Даследчыца беларускіх кнігазбораў Л. Сільнова выказала меркаванне, што экслібрыс для В. Ластоўскага мог

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стварыць беларускі мастак Язэп Драздовіч, які супрацоўнічаў у той перыяд з газетай «Наша ніва» [12, с. 133–134]. Разам з тым, небеспадстаўна лічыць, што аўтарам экслібрыса быў сам Ластоўскі, які ў той час ужо меў досыць удалыя спробы стылізацыі ўзораў слуцкіх паясоў у кніжнай графіцы.

Экслібрыс выкананы ў спрошчанай графічнай манеры. Кампазіцыйна ён падзелены на тры часткі па гарызанталі. Выява фіранкі з двума аваламі, у якія ўпісаны дрэўцы з трыма кветкамі, абрысы якіх нагадваюць беларускія валошкі, нагадвае кампазіцыю заканчэння – «галавы» слуцкага пояса, змешчана ўверсе, над паліцай з тамамі кніг. Пад паліцай на фоне павуціння размешчаны вялікія літары «В. Л.», абапал якіх – два прамавугольнікі: на адным пазначана «№», поле другога пустое, прызначанае для ўпісвання ад рукі нумара кнігі. Вобраз узнёсласці чалавечага духу ад цемры падзямелля ці лабірынта, вобраз якога пазней будзе ўвасоблены Ластоўскім у вядомым літаратурным творы «Лабірынты» (1923), узнімаецца праз асвету – кнігі – да вяршыні нацыянальнай культуры, якую сімвалізуюць слуцкія паясы.

Гэты мініяцюрны твор кніжнай графікі В. Ластоўскага сродкамі мастацка-кампазіцыйнай выразнасці вобразна-сімвалічна выявіў вехі нацыянальнага культурнага станаўлення і канструкцыю нацыянальнай канцэпцыі быцця беларусаў. Зусім не выпадкова матыў арнаментыкі слуцкіх паясоў прысутнічае і ў экслібрысе краязнаўцы, этнографа і мастацтвазнаўца, супрацоўніка секцыі беларускага мастацтва Інстытута беларускай культуры Міколы Каспяровіча (1900–1937). Кніжны знак быў створаны для яго віцебскім мастаком Я. С. Мініным у 1925 г. У тым жа годзе ў газеце «Савецкая Беларусь» (№ 219) быў надрукаваны артыкул М. Каспяровіча «Слуцкія паясы (да Усебеларускай мастацкай выстаўкі)», у якім слуцкія паясы залічваліся да твораў, што павінны выявіць мастацкія памкненні беларускага народа і садзейнічаць стварэнню нацыянальнага стылю [4].

Не без удзелу В. Ластоўскага працягвалася даследаванне слуцкіх паясоў у Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульце) у Мінску. Як вядома, у 1927 г. ён вярнуўся ў БССР, працаваў на пасадзе неадменнага сакратара Інбелкульта і ўзначаліў Беларускі дзяржаўны музей, дзе якраз у час яго прыезду ў Мінск экспанавалася выстаўка «Слуцкія паясы» [5].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследаванне слуцкіх паясоў, старажытнага дойлідства, іканапісу, графікі, народнага арнаменту становіцца прыярытэтным кірункам вывучэння беларускага мастацтва ў 1920-я гг. у БССР. Гэтай праблематыкай займаліся секцыя беларускага мастацтва і камісія па гісторыі мастацтва, у дзейнасці якіх чынны ўдзел прымаў В. Ластоўскі. Як сведчаць архіўныя матэрыялы, у 1927 г. ён вывучаў «наменклатуру арнаменту» і рыхтаваў да друку яго альбом [13, арк. 55, 58–59]. Праблему паходжання і развіцця арнаменту, слуцкія паясы і іх арнаментыку даследаваў мастацтвазнавец, навуковы сакратар Інбелкульта па вывучэнні мастацтва, дацэнт кафедры гісторыі мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Мікола Шчакаціхін (1896–1940), з імем якога звязана станаўленне айчыннага мастацтвазнаўства. «Ювелірныя вырабы, гафты, тканіны, слуцкія паясы, урэчанскае шкло – усё гэта складае салідную групу мастацкіх вырабаў, досыць высокіх у тэхнічных адносінах і вельмі каштоўных у сэнсе выяўлення шэрагу характэрных арнаментальных форм», – пісаў у тыя гады вучоны, вызначаючы напрамкі даследавання беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва [15, с. 2]. Секцыя беларускага мастацтва Інбелкульта планавала выдаць у 1927–1928 гг. яго манаграфію «Слуцкія паясы», у якой меркавалася разгледзець паходжанне слуцкіх паясоў, гісторыю іх вырабу і развіццё арнаментыкі [13, арк. 104].

Манаграфія аб слуцкіх паясах М. Шчакаціхіна не паспела ўбачыць свет. У 1929 г. адбылася рэарганізацыя Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук. У той жа час узнялася хваля рэпрэсій супраць дзеячаў беларускай культуры і навукі, якая прыпыніла навуковыя даследаванні па вызначаных раней кірунках, перакрэсліла выдавецкія планы. Пастановамі СНК БССР 20 лістапада 1929 г. В. Ластоўскі быў вызвалены ад абавязкаў сакратара Беларускай Акадэміі навук, а 21 ліпеня 1930 г. – арыштаваны ДПУ БССР па справе «Саюза вызвалення Беларусі».

У ХХ ст. слуцкаму поясу было наканавана ператварыцца з прадмета раскошы і мастацтва ў беларускі нацыянальны сімвал. Слуцкі пояс-міф, яго сімвалічны вобраз неадрыўныя ад гісторыі станаўлення нашай нацыі і з’яўляецца адным з найбольш яскравых культурных маркераў працэсу выспявання беларускай ідэнтычнасці.У значнай ступені гэтаму садзейні-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалі дзейнасць і мэтанакіраваныя намаганні Вацлава Ластоўскага па ўключэнні слуцкіх паясоў у культуратворчы ўжытак Беларусі на золку станаўлення ідэі аб нацыянальнай суверэннасці нашай краіны, пераўтварэнне слуцкіх паясоў у міфалагему як важны складнік канструявання нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў.

*1.* Аб зацвярджэнні Дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гады [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.government.by/ ru/solutions/ 1904. – Дата доступу: 20.06.2015.

*2.* Власт. Слуцкія паясы // Крывіч. – 1924. – № 1(7). [Электронны рэсурс]. – Режым доступу: http://www.arche.by/by/page/science/10831. – Дата доступу: 04.03.2015.

*3. Ельскі, А.* Гістарычныя звесткі пра радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку / А. Ельскі // Выбранае. – Мінск : «Беларускі кнігазбор», 2004. – С. 65–86.

*4. Каспяровіч, М.* Слуцкія паясы (да Усебеларускай мастацкай выстаўкі) / М. Каспяровіч. – Савецкая Беларусь. – 1925. – № 219.

*5.* Каталёг выстаўкі слуцкіх паясоў / Беларускі дзяржаўны музей. – Менск : Друкарня Інстытуту Беларускае культуры, 1927. – 20 с.

*6. Лабачэўская, В. А.* Зберагаючы самабытнасць : З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 375 с., іл.

*7. Лабачэўская, В. А.* Слуцкі пояс : культуралагічны зрэз міфа / В. А. Лабачэўская // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый», Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г. / рэдкал.: В. Скалабан (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – (Беларусіка = Albaruthenika ; кн. 21). – С. 205–213.

*8. Ластоўскі, В.* Мае ўспаміны аб М. Багдановічы / В. Ластоўскі // Крывіч. – 1926. – № 1 (11). – Каўнас, 1926. – С. 62–66.

*9. Ластоўскі, В.* Кароткая энцыклапедыя старасвеччыны / В. Ластоўскі : уклад. Я. Янушкевіча. – Мінск : Хурсік, 2003. – 228 с.

*10. Марціновіч, А.* Свяці, зорка, свяці : [да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча] / А. Марціновіч // Полымя. – 2011. – № 10. – С. 112–129.

*11. Сільнова, Л.* Экслібрыс Вацлава Ластоўскага – гісторыка, пісьменніка і грамадскага дзеяча Беларусі / Л. Сільнова // Бібліятэчны свет. – 1998. – № 4. – С. 19.

*12. Сільнова, Л. Д.* Экслібрыс Вацлава Ластоўскага – беларускага гісторыка, пісьменніка і грамадскага дзеяча / Л. Д. Сільнова // Матэрыялы Першых кнігазнаўчых чытанняў (Мінск, 15 верасня 1998 г.) / [складальнік: Т. І. Рошчына]. – Мінск : НББ, 2000. – С. 129–135.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*13.* Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 22. – Арк. 55, 58–59, 104.

*14. Шлюбскі, Ал.* Exlibris'ы А. Тычыны / Ал. Тычына. – Менск : Беларускае таварыства бібліофілаў, 1938. – [б/с].

*15. Шчакаціхін, М.* Нарысы па гісторыі беларускага мастацтва / І. Шчакаціхін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 336 с.

*16. Юркоць, А.* «Смык беларускі» з кнігазбору Вацлава Ластоўскага / А. Юркоць // Матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі «Шляхамі Вацлава Ластоўскага» : да 125-годдзя з дня нараджэння гісторыка, пісьменніка, акадэміка АН Беларусі, г. Маладзечна, 4 верасня 2008 г. / [падрыхт. тэксту і ўкладанне М. Казлоўскага]. – Маладзечна : Перамога, 2008. – С. 43–44.

*17. W. Sluckije pajsy* / [В. Ластоўскі] // Homan. – 1916. – 24 сакавіка. – S. 3–4 (у раздзеле «З антыкварскіх запісак»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ДУХОВНЫЕ ФАКТОРЫ ВЕЛИКОЙ ПОБЕДЫ

***А. Н. Ладутько,***
*заведующий кафедрой социально-гуманитарных дисциплин,*
*кандидат философских наук, доцент;*
*Белорусская государственная академия музыки*

Называя важнейшие факторы Великой Победы, Маршал Советского Союза Г. К. Жуков подчеркивал: «Развитая индустрия, колхозный строй, всеобщая грамотность, единство наций, сила социалистического государства, высочайший патриотизм народа, руководство партии, готовой слить воедино фронт и тыл, – это была великолепная основа обороноспособности гигантской страны, первопричина той грандиозной победы, которую мы одержали в борьбе с фашизмом» [1].

Военными историками давно замечено: если сломлен дух, сломлена воля, то война будет проиграна, даже при военно-техническом и экономическом превосходстве. И наоборот: если дух народа не сломлен, война не проиграна, даже при больших первоначальных успехах врага.

Наряду с политическими, экономическими, собственно военным и другими факторами, способствовавшими достижению Победы над агрессором, чрезвычайно важную роль сыграл фактор духовный. Несмотря на сложности и противоречия предвоенного социалистического строительства, мировоззрение народа формировали, главным образом, не отрицательные